Такім чынам, аналіз этнаканфесійнай сітуацыі, якая склалася на беларускіх землях у разглядаемы перыяд, яскрава сведчыў аб тым, што на пасады духавенства прызначаліся прадстаўнікі карэнных нацыянальнасцей. Аднак у выпадках, калі іх пачыналі замяшчаць іншаземцы, палітычная эліта дзяржавы дабівалася патрэбнага для сябе рашэння.

[1] Гл.: Вялікае Княства Літоўскае: Энцыкл.: У 2 т. Мінск, 2005. Т. 1. С. 83.
[2] Гл.: Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000. С. 60.
[3] Гл.: АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 37.
[4] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Т. 1. С. 450.
[5] Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док. и материалов. Минск, 1959. Т. 1. С. 389.
[6] Ламанский В. И. Белая Русь // Имя твое Белая Русь. Минск, 1991. С. 17.
[7] АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 73, 120.
[8] АЗР. СПб., 1848. Т. 2. С. 279.
[9] ПСРЛ. М.; Л., 1963. Т. 28. С. 89.
[10] АЗР. СПб., 1846. Т. 1. С. 237.
[11] Гл.: Вялікае Княства Літоўскае. С. 75.
[12] Вестник Западной России. Вильно, 1868. Кн. 6. Т. 2. С. 62.
[13] Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2002. С. 75–76.
[14] Уния в документах. Минск, 1997. С. 203–204.
[15] Там жа. С. 195.
[16] Там жа С. 80.
[17] АВАК. Вильно, 1867. Т. 2. С. 152.
[18] Гл.: Лойка П. А. Указ. тв. С. 72.
[19] Гл.: Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. С. 66.
[20] Там жа. С. 66–67.

Паступіў у рэдакцыю 20.09.12.

*Юрый Леанідавіч Казакоў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў.

*Н. В. КАРПОВІЧ*

## ЗМЕНЫ Ў СТРУКТУРЫ ПРАВАСЛАЎНЫХ ПРЫХОДАЎ У БЕЛАРУСІ Ў 1860–1890-х гг.

Рассматриваются факторы, оказавшие влияние на изменение структуры православных приходов во второй половине XIX в. Анализируются причины и последствия реформирования православных приходов. Характеризуются особенности установления территориальных границ приходов, их численность; определен штатный состав приходского духовенства, его структурные особенности. Отмечается, что изменения в структуре приходов на территории Беларуси имели свои специфические черты.

In that article there are showed the factors which had influence on reorganization of orthodox parishes in Belarus during the second half of the 19 th century. Causes and results of reorganization parishes are analyzed. The limit of orthodox district, number of peasants is characterized; the influences of service structure on staff of orthodox estate are analyzed. The specific traits of orthodox parishes in Belarus are marked.

У перыяд царкоўных рэформ 1860–1870-х гг. палітыка ўрадавых колаў была скіравана на аднаўленне эфектыўнай дзейнасці праваслаўных прыходаў. Менавіта духавенству адводзілася галоўная роля ў рэалізацыі гэтых задач. Праваслаўнае духавенства займалася трансляцыяй урадавых праграм, абнародавала ўказы імператара, а таксама прымала актыўны ўдзел у вырашэнні сацыяльных праблем грамадства. Новыя задачы патрабавалі перагляду пазіцый духавенства, звязаных з вызначэннем яго прававога і сацыяльнага статусу. Іх рэалізацыя пры адначасовым павелічэнні стандартаў царкоўнай службы выклікала змены ў самой структуры прыхода. На тэрыторыі Беларусі ва ўмовах узмоцненай русіфікацыі дадзены працэс быў адметным у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз змен у структуры праваслаўных прыходаў Беларусі ў другой палове XIX ст. У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі праз прызму характарыстыкі канфесійнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ў працы В. Яноўскай[1] знайшлі адлюстраванне асобныя аспекты па абазначанай праблеме. У той жа час расійскімі аўтарамі С. Рымскім[2], В. Фёдаравым[3] паказаны мерапрыемствы ўрада ў накірунку рэфармавання прыходаў у кантэксце царкоўных рэформ. Але спецыфіка ўказаных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў іх атрымала фрагментарнае асвятленне.

Праваслаўны прыход складаўся з прычту (прыхадскога духавенства) і прыхаджан, якія пражывалі ў межах праваслаўнага храма. Прыхадское духавенства складала асноўную масу белага духавенства. У Беларусі ў праваслаўных прыходах пражывала ў канцы XIX ст. 84,2 % духавенства. Прычт складаўся з трох асноўных груп – святароў, дыяканаў і прычэтнікаў. Прадстаўнікі кожнай групы мелі розны духоўны статус і адпаведна яму – розныя абавязкі пры выкананні царкоўных абра-

даў. Святар выконваў галоўную ролю, без яго ўдзелу не праводзіліся ніякія богаслужэнні, абрады, адпраўленні. На пасадзе настаяцеля храма ён займаўся кіраўніцтвам прычту і прыхода. На правах асноўнай службовай асобы ў прыходзе менавіта настаяцель сачыў за дакладным афармленнем метрычных запісаў, кніг вобыску, споведных роспісаў[4]. За бездакорную службу ў прыходзе, а таксама за пяцідзесяцігоддзе сваёй працоўнай дзейнасці святар атрымліваў ранг протаіерэя[5]. Сярод протаіерэяў значнае месца займалі кафедральныя протаіерэі. Яны з'яўляліся адначасова намеснікамі епархіяльнага архірэя ў кіраванні епархіяй і настаяцелямі кафедральнага сабора. Гэту пасаду займалі самыя вопытныя і паважаныя прадстаўнікі духавенства, для якога яна была фактычна пажыццёвай.

Дыяканы займалі ніжэйшую ступень свяшчэнства ў царкоўнай іерархіі і дапамагалі епіскапу або святару арганізоўваць падрыхтоўку да адпраўлення богаслужэння, загадвалі царкоўнымі прадметамі. У адрозненне ад святара дыякан прымаў удзел у богаслужэнні, служыў пры адпраўленнях, але самастойна не займаўся іх правядзеннем[6]. Калі дыякан выконваў службу ў епархіяльным саборы, ён меў тытул протадыякана. Дыякан да пачатку богаслужэння маліўся, рыхтаваў вопратку для сябе і святара, а таксама богаслужэбны інвентар.

У царкоўнай іерархіі былі ніжэйшыя службовыя пасады: прычэтнікі (з 1885 г. – псаломшчыкі), якія не мелі статусу свяшчэнства і належалі да царкоўнаслужыцеляў. Яны выконвалі дапаможную ролю ў падрыхтоўцы і правядзенні богаслужэнняў. Акрамя таго, ім даручалася весці ўсю царкоўную дакументацыю. Але ў выніку царкоўных рэформ на пасады царкоўнаслужыцеляў прызначаліся таксама і дыяканы, якія спалучалі дыяканскія і прычэтніцкія службовыя функцыі.

Унеслі карэктывы і змянілі структуру праваслаўных прыходаў царкоўныя рэформы 1860–1870-х гг. Асноўнай мэтай гэтых змен было паляпшэнне матэрыяльнага становішча прыхадскога духавенства. Таму ўрад паводле палажэння ад 16 красавіка 1869 г. «Аб складзе прыходаў і царкоўных прычтаў», распрацаванага Асабовай прысутнасцю, вырашыў скараціць штатныя адзінкі духавенства, а сродкі накіраваць на паляпшэнне застаўшыхся святароў. У выніку ў цэлым у Расійскай імперыі палепшыць становішча праваслаўнага белага духавенства за кошт скарачэння свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў не ўдалося. У беларускіх епархіях урад у чарговы раз павялічыў аклады духавенству, але рэалізацыя скарачэння колькасці царкоўных пасад была адметнай. Новыя штатныя адзінкі ўводзіць у беларускіх епархіях не спяшаліся. У Магілёўскай епархіі яны былі зацверджаны ў 1873 г., у Літоўскай, Мінскай, Полацкай – у 1875 г. Акрамя таго, мясцовыя архірэі, скарыстаўшыся нявызначанасцю палажэння, адкрылі царкоўных прыходаў болей, чым існавала раней, што патрабавала дадатковых кадраў[7]. Паводле дадзеных С. В. Рымскага, штатныя адзінкі скараціліся за кошт дапаможнага персаналу – прычэтнікаў, а колькасць свяшчэннаслужыцеляў нават стала большай. Так, у Літоўскай епархіі штат святароў узрос на 40 чал., у Мінскай – на 18, у Полацкай – на 32. У якасці прыкладу можна прасачыць павелічэнне штату святароў у прыходах Літоўскай епархіі. На момант увядзення новых штатных адзінак святароў у колькасці 37 вакантнымі былі яшчэ 9 месцаў святароў – усяго 46. З іх ліку 6 святароў адразу прызначылі на новыя пасады. Атрымалася, што штат святароў павялічыўся на 40 чал., але агульная колькасць прычэтнікаў скарацілася амаль на трэць[8].

У напрамку рэфармавання структуры прыходаў былі перагледжаны іх межы. У дарэформенны час склад прыходаў у заходніх губернях вызначаўся палажэннем 1842 г., згодна з якім усе прыходы падзяляліся на сем класаў, што ў сваю чаргу вызначаліся колькасцю прыхаджан. Яна вагалася ад 100 да 3000 чал. У заходніх губернях, у тым ліку і ў Беларусі, пераважалі нешматлікія прыходы 1–4-га класа, у якіх пражывала ад 100 да 700 асоб мужчынскага полу. Так, напрыклад, у 1860 г. у дзевяці заходніх губернях агульная колькасць вясковых прыходаў была 5486[9]. З іх удзельная вага нешматлікіх прыходаў складала 76 %. Але часцей прыходы ўтвараліся з парушэннем іх кампактнасці, што ўскладняла службовыя функцыі духавенства. Сярод нешматлікіх прыходаў толькі ў 838 (прыкладна 20 %) хаты вяскоўцаў знаходзіліся адносна недалёка, прыкладна на адлегласці не болей 5 вёрст ад царквы. З мэтай упарадкавання камплектавання прыходаў падчас рэформ было вырашана скасаваць невялікія, нешматлікія па колькасці прыхаджан прыходы праз аб'яднанне іх з іншымі. Змяненне межаў прыходаў ставіла мэту ўраўняць прыходы па колькасці прыхаджан. Пры рэалізацыі гэтай пастановы рэкамендавалася ўлічваць наступныя крытэрыі: колькасны склад прыходаў, адлегласць паміж цэрквамі, магчымасць камфортна да іх дабірацца вяскоўцам, змястоўнасць цэркваў, а таксама рэкамендацыі і пажаданні прыхаджан. Адначасова іх рэалізацыя ўскладнялася ўвядзеннем новых штатных адзінак духавенства. Нягледзячы на тое што гэты працэс зацягнуўся ў Літоўскай, Мінскай і Полацкай епархіях да 1875 г., нараканні з боку праваслаўнай паствы працягваліся. Так, напрыклад, прыхаджане Альшанскага прыхода ў Літоўскай епархіі былі абураны

пераносам іх царквы на адлегласць сямі вёрст, раней яна знаходзілася на адлегласці не болей трох вёрст. У той жа час яны скардзіліся, што парушэнне былых межаў прыхода перашкаджала наведваць новую царкву з-за штогадовых павадкаў рэк і балот[10].

У выпадку аб’яднання нешматлікіх прыходаў адзін з храмаў лічыўся галоўным прыхадскім, а скасаванага прыхода – прыпісаным да яго. У выніку рэалізацыі адзначанай пастановы колькасць галоўных храмаў у гарадскіх прыходах у Літоўскай (Віленскай і Гродзенскай губернях), Магілёўскай, Мінскай і Полацкай епархіях толькі крыху перавышала за палову і складала 66 % (агульная колькасць цэркваў – 109). У вясковых прыходах гэты паказчык значна вышэй і дасягнуў 80 % (агульная колькасць цэркваў у вясковых прыходах – 1917)*. Гэтыя паказчыкі сведчылі аб нязначным скарачэнні ў складзе прычтаў. Адметна тое, што толькі ў галоўнай прыхадской царкве прызначалася духавенства.

У рамках царкоўных рэформ 1860–1870-х гг. былі перагледжаны штаты прыхадскіх прычтаў. У дарэформенны час яны вызначаліся палажэннем 1842 г. Адпаведна класу прыхода вызначаліся штатныя памеры кожнага з іх. У штатны расклад уваходзіла ад 2 да 7 чал. Укамплектаванасць штатнага персаналу адбывалася з ліку свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў: прычэтнікаў, дзячкоў, панамароў, прасфорняў. Згодна з новым штатным раскладам, у кожным галоўным храме прадугледжвалася наяўнасць двух клірыкаў: святара і царкоўнаслужыцеля-прычэтніка. У выпадку, калі прыход з’яўляўся шматлікім, са значнай колькасцю населеных пунктаў, якія далёка знаходзіліся ад царквы, у дапамогу свяшчэнніку (настаяцелю) прызначаліся яго памочнікі, так званыя малодшыя святары. Таксама, нават калі па штаце належаў толькі адзін свяшчэннік, можна было прызначыць двух прычэтнікаў у званні псаломшчыкаў, але пры ўмове, што ў прыходзе пражывала не менш тысячы асоб мужчынскага полу. У выніку ўтвараліся прыходы наступнага ўзору: настаяцель і прычэтнік; настаяцель і два прычэтнікі; настаяцель, яго памочнік і два прычэтнікі. Так, напрыклад, у Гродзенскай губерні ў 1875 г. колькасць прыходаў у адпаведнасці з першым варыянтам складала 249, з другім – 28, з апошнім – 39[11]. На працягу 1860–1890-х гг. колькасць прыходаў, укамплектаваных па схеме адзін свяшчэннік і адзін (прычэтнік) псаломшчык, да якой імкнуліся ўвесь час улады, павялічвалася. У 1892 г. у Гродзенскай губерні такіх прыходаў было ўжо 265[12]. Перагляд штатаў не закрануў вайсковых, адзінаверскіх цэркваў і храмаў пры могілках і казённых установах. Для прычтаў кафедральных сабораў былі ўсталяваны з 1 студзеня 1869 г. адзіныя штаты: протаіерэй, ключар, два святары, протадыякан, два дыяканы, два іпадыяканы, два псаломшчыкі.

Акрамя прычтаў кафедральных сабораў, у парушэнне кананічных нормаў са штатаў выключаліся ўсе дыяканы. Яны на працягу двух месяцаў пасля выдання пастановы мелі права ўладкавацца на месца прычэтнікаў, але ў стане выконваючых абавязкі. У асяродку прычэтнікаў Літоўскай епархіі адбыліся наступныя колькасныя змены. Усяго была 71 вакансія, у тым ліку 64 зноў адкрытых. Пасля ўладкавання 37 прычэтнікаў і 7 дыяканаў не занятымі засталіся яшчэ 27 пасад. Але пры размеркаванні на іх месца неўладкаваных 20 дыяканаў вакантнымі засталіся толькі 7 месцаў псаломшчыкаў[13]. У выніку дыяканы на прычэтніцкіх вакансіях спалучалі дзве службовыя функцыі.

Заканадаўствам дазвалялася па жаданню вясковой грамады і на яе сродкі ўводзіць дадатковую штатную пасаду дыякана. Але ў большасці выпадкаў, спасылаючыся на зацверджаныя штатныя расклады, епархіяльнае кіраўніцтва адмаўляла прыхаджанам. Так здарылася з жыхарамі Бабруйскага благачыння Мінскай епархіі, якія неаднаразова звярталіся з падобным прашэннем[14]. Такім чынам, паляпшаючы ўзровень царкоўнаслужыцеляў (прычэтнікаў), рэфарматары спадзяваліся павысіць стандарты царкоўнай службы. У ідэале службовая рэформа павінна была запоўніць прабел паміж свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелямі, трансфармуючы іх з палажэння асобных сацыяльных груп у два ўзроўні адной і той жа іерархіі, што павышала б статус і мабільнасць духавенства.

Увядзенне новых штатаў выключыла з іх штату асоб, якія выконвалі дапаможныя царкоўныя функцыі, у тым ліку і прасфорняў. У адпаведнасці са штатным раскладам склад прычту супадаў з тым колам асоб, каго прылічалі юрыдычна да духоўнага саслоўя. У той жа час, як паказвала практыка, прасфорні ў асобных прыходах працягвалі сваю дзейнасць, але не атрымлівалі жалавання.

Пасля закрыцця ў 1885 г. Асабовай прысутнасці адбываюцца змены ў структуры прыходаў. Заканадаўча мясцовым епархіяльным архірэям дазвалялася самастойна аднаўляць прычты ў прыпісных цэрквах, а таксама адкрываць былыя прыходы. Адмяняўся падзел святароў на настаяцеляў і іх памочнікаў, а таксама падзел прычэтнікаў на псаломшчыкаў і выконваючых іх абавязкі. З гэтага часу ўсе прычэтнікі сталі псаломшчыкамі. Па ўсталяваных у 1885 г. новых штатах прыхода з колькасцю

---

* Падлічана паводле дадзеных: Росписание городских и сельских приходов, церковных причтов Виленской губернии Литовской епархии; Росписание городских и сельских приходов, церковных причтов Гродненской губернии Литовской епархии; Росписание городских и сельских приходов, церковных причтов Минской епархии; Росписание городских и сельских приходов, церковных причтов Полоцкой епархии.

менш за 700 прыхаджан мужчынскага полу дазвалялася мець аднаго святара і аднаго псаломшчыка, больш за 700 прыхаджан – святара, дыякана і псаломшчыка, у буйных прыходах – два і болей святары, дыяканаў і псаломшчыкаў – па аднаму на кожнага святара. Новыя штаты ўводзіліся ў беларуска-літоўскіх епархіях, але мелі некаторыя адметнасці, паколькі мясцоваму епархіяльнаму кіраўніцтву дазвалялася прызначыць дыякана пры колькасці прыхаджан і менш за 700. Рэалізацыя дадзенай пастановы выклікала перагляд складу прычтаў. У большасці з іх колькасць псаломшчыкаў перавышала запланаваныя суадносіны. Так, у Мінскай епархіі было выяўлена 4 варыянты ўладкавання прычтаў, якія не адпавядалі новым правілам. Лішнім псаломшчыкам давалася два гады на ўладкаванне на новае месца[15]. Такім чынам, быў зноў усталяваны інстытут дыяканаў, што адпавядала кананічным нормам, якія патрабуюць наяўнасці святара, дыякана, псаломшчыка.

У выніку змен у структуры прыходаў і мабільнасці ў групе прыхадскога духавенства змяняюцца колькасныя суадносіны ў складзе духоўнага саслоўя. Да царкоўных рэформ 1860–1870-х гг. колькасць царкоўнаслужыцеляў была большай за паказчык свяшчэннаслужыцеляў. Так, напрыклад, у 1866 г. у Расійскай імперыі свяшчэннаслужыцеляў (святары і дыяканы) сярод прыхадскога духавенства было 44 %, царкоўнаслужыцеляў – 55,5 %. Падобная тэндэнцыя прасочваецца і ў беларускіх епархіях. Так, напрыклад, у 1866 г. у Мінскай і ў 1869 г. у Літоўскай епархіях колькасць царкоўнаслужыцеляў была ў 1,5 разы большай, чым свяшчэннаслужыцеляў.

Паступова ўдзельная вага свяшчэннаслужыцеляў павялічвалася. Так, у 1892 г. у Магілёўскай, Мінскай, Літоўскай і Полацкай епархіях удзельная вага свяшчэннаслужыцеляў складала 53 %, царкоўнаслужыцеляў – 46,8 %. Паводле статыстычных дадзеных перапісу 1897 г., у цэлым па Расійскай імперыі суадносіны паміж свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелямі наступныя: 57 і 42 % адпаведна[16]. Прыкладна падобныя лічбавыя паказчыкі і ў Беларусі. Згодна з перапісам 1897 г., колькасць свяшчэннаслужыцеляў Беларусі ў групе духавенства складала 56,3 %, а царкоўнаслужыцеляў – 43,6 %.

У групе прыхадскога духавенства найменш было протаіерэяў, найбольш – прычэтнікаў. У 1860–1890-х гг. у складзе праваслаўнага духавенства ў цэлым у Расійскай імперыі адбываецца павелічэнне колькасці протаіерэяў і святароў, дыяканаў, але нязначнае. У гэты перыяд значнае скарачэнне адбылося шматлікай групы прычэтнікаў. Так, напрыклад, у Мінскай епархіі ў 1866 г. протаіерэяў было 10 чал., святароў – 540, дыяканаў – 62, прычэтнікаў – 920, у 1892 г. – 31, 546, 63, 552 адпаведна. У Полацкай епархіі таксама адбываецца павелічэнне ў асяродку свяшчэннаслужыцеляў: у 1865 г. протаіерэяў было 14 чал., святароў – 283, дыяканаў – 54, у 1892 г. – 21, 334, 71 адпаведна (статыстычныя дадзеныя аб колькасці прычэтнікаў адсутнічаюць). У Літоўскай епархіі ў 1869 г. выконвалі службу: протаіерэяў – 23 чал., святароў – 529, дыяканаў – 61, прычэтнікаў – 919. У 1892 г. адбываецца павелічэнне колькасці протаіерэяў і святароў – 26 і 538 адпаведна, але колькасць духавенства ў групе дыяканаў і псаломшчыкаў змяншаецца.

У другой палове XIX ст. пры рэалізацыі царкоўных рэформ адбыліся змены ў структуры праваслаўных прыходаў. Але ў выніку выкарыстання мясцовымі архірэямі недакладнасцей палажэнняў у цэлым тэрытарыяльная цэласнасць прыходаў была захавана, скарачэнне духавенства адбылося толькі сярод выхадцаў з царкоўнаслужыцеляў. Нават мерапрыемствы ўрада, якія часам праводзіліся ў разрэз з кананічнымі нормамі, не парушылі працэс фарміравання новага тыпу добраадукаванага, вопытнага, дынамічнага святара.

[1] Гл.: Яноўская В. В. Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. Мінск, 2002.
[2] Гл.: Римский С. В. Российская церковь в эпоху великих реформ (Церковные реформы в России 1860–1870-х годов). М., 1999.
[3] Гл.: Фёдоров В. А. Русская православная церковь и государство: Синодальный период (1700–1917). М., 2003.
[4] Гл.: Инструкция для причтов Полоцкой епархии. Витебск, 1888.
[5] Гл.: Минские епархиальные ведомости. 1869. № 12 (часть официальная). С. 165.
[6] Гл.: Как различать духовенство по чинам и званиям. М., 1999. С. 4.
[7] Гл.: Извеков Н. Д. Исторический очерк состояния Православной церкви в Литовской епархии за время с 1839–1889 гг. М., 1899.
[8] Гл.: Римский С. В. Указ. тв. С. 532.
[9] Там жа. С. 184.
[10] Гл.: Извеков Н. Д. Указ. тв. С. 215.
[11] Гл.: Падлічана паводле дадзеных: Литовские епархиальные ведомости. 1869. № 13–22 (часть официальная).
[12] Гл.: Падлічана паводле дадзеных: Иосиф. Гродненский православно-церковный календарь, или Современное состояние православной церкви в Гродненской губернии. Гродно, 1893. III, 326.
[13] Гл.: Местные распоряжения по поводу расписания приходов и причтов Литовской епархии // Литовские епархиальные ведомости. 1876. № 16. С. 121–125.
[14] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 32027. Л. 47.
[15] Там же. Спр. 3598. Л. 64.
[16] Гл.: Падлічана паводле дадзеных: Фёдоров В. А. Указ. тв. С. 30; Православная энциклопедия / Под ред. Патриарха Московского и всея Руси Алексия II. М., 2000. С. 132.

Паступіў у рэдакцыю 25.09.12.

*Наталля Валяр'янаўна Карповіч* – выкладчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу.